НЯКАЗАЧНЫЯ СТРАСЦІ. ЯК ПІСАЦЬ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ? 8

АСЦЯРОЖНА: КАСМЕТЫКА! ЯЕ «ЦЁМНЫ БОК» 9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

6 ЧЭРВЕНЯ 2018 г. СЕРАДА № 106 (28722)

ЛІЧБА ДНЯ

Больш за 110 тысяч

гасцей і ўдзельнікаў чакаюць на рэспубліканскім свяце «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»), якое пройдзе 7-8 ліпеня на беразе Дняпра ў аграгарадку Александрыя Шклоўскага раёна. Падчас свята адбудзецца вялікая колькасць культурных і забаўляльных мерапрыемстваў з удзелам айчынных і замежных музыкантаў, артыстаў і творчых калектываў. У ліку краін-удзельніц Беларусь, Расія, Украіна, Эстонія, Літва, Латвія, Польшча і Германія.

КОРАТКА

● Міністэрства транспарту і камунікацый лічыць неабходным адвязаць выплату дарожнага збору ад працэдуры праходжання дзяржтэхагляду. Такое меркаванне выказаў міністр транспарту і камунікацый Анатоль Сівак. Ён адзначыў, што «на працягу трэцяга квартала з'явіцца яснасць, каб з 1 студзеня 2019 года сістэма памянялася».

● **У Століне камунальнікі ўсталявалі копію Эйфелевай вежы. Вышыня канструкцыі складае 11,5 м. Новая славутасць арганічна ўпісалася ў прастору каля фантана галоўнай плошчы горада. Вежа асвятляецца ў цёмны час сутак, каля падножжа размешчана кветкавая клумба.**

● У гандлёвых аб'ектах Мінскай вобласці 9 чэрвеня з 0.00 да 24.00 не будзе ажыццяўляцца продаж піва і слабаалкагольных напояў з аб'ёмнай доляй этылавага спірту не больш за 7 %.

● **У Маларыце мясцовы жыхар выявіў касцяныя астанкі. Па выніках папярэдняга даследавання, у пахаванні знойдзены парэшткі дзесяці мужчын і адной жанчыны. На гэтай тэрыторыі ў 1940-х гадах праходзілі баявыя дзеянні.**

Сем дзён, якія год кормяць

Сучасныя тэхналогіі ў сельскай гаспадарцы прадставілі на Беларускім аграпрамысловым тыдні, які стартаваў 5 чэрвеня

Эфектыўныя кантакты, інавацыі і паспяховыя кантракты: Беларускі аграпрамысловы тыдзень — свайго роду справаздача за год для прамыслоўцаў, навукоўцаў і аграрыяў краіны. Пляцоўкай маштабнага міжнароднага мерапрыемства стаў гандлёва-лагістычны комплекс аграгарадка Шчомысліца, што пад Мінскам. Геаграфія ўдзельнікаў выстаў — ад Кітая да Вялікабрытаніі, усяго 28 краін і больш за паўтысячы кампаній, якія працуюць у аграпрамысловым сектары. СТАР. 4

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

■ Тэма

РЫБАЛКА... ВЫСОКАГА НАПРУЖАННЯ

Наша краіна літаральна працята лініямі электраперадачы. І калі пад імі проста прайсці па дарозе, то нічога кепскага не здарыцца — паветра, як вядома, ток не праводзіць. Але закрануць незнарок провад можна звычайнай вудачкай падчас рыбалкі ў недазволеным месцы. Разрад — і гэтая неахайнасць становіцца апошняй у жыцці рыбака.

Вуглепластык: трывалы і небяспечны

З 2012-га па май 2018 года адбыліся 24 няшчасныя выпадкі ад удару электратокам з рыбакамі. Сярод іх два групавыя. Загінула 19 чалавек, цяжкія траўмы атрымалі сямёра.

За лічбамі — трагедыі сем'яў, якія засталіся без мужоў, сыноў, бацькаў...

— Калі адкруціць час гадоў на дзесяць назад, то такой праблемы паражэння рыбакоў электратокам не было, — кажа **начальнік упраўлення дзяржаўнага энергетычнага нагляду «Белэнерга» Дзмітрый ЛАСЯНКОЎ.** — Яны карысталіся тады пластыкавымі або бамбукавымі вудамі, якія ток не праводзяць. Але з сярэдзіны нулявых у продажы масава пачалі з'яўляцца вуглепластыкавыя вуды, якія атрымалі ў рыбакоў велізарную папулярнасць. Ім жа патрэбна што? Каб вуда была як мага больш доўгай, трывалай і ёмкай. Вуглепластыкавыя вырабы па ўсіх гэтых крытэрыях лепшыя. Але пры ўсіх выгодах яны праводзяць ток. СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Вы гарантуеце сабе і сваім блізкім, аформіўшы падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Заставайцеся з намі — будзе цікава!